Надвор'е

ЯШЧЭ ТРОХІ ПАГРЭЕМСЯ

Чакаецца анамальна цёплае для гэтага часу надвор'е

Асабліва цёпла на гэтым тыдні будзе ў паўднёвых раёнах краіны, але без дажджоў не абыдзецца, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Ужо сёння ўмовы надвор'я будуць вызначацца паступленнем цёплай паветранай масы з паўднёвага захаду Еўропы, але ва ўсходніх раёнах захаваецца ўплыў франтальнага падзелу. А гэта абумовіць вялікія кантрасты тэмператур паміж паўночным усходам і паўднёвым захадам краіны. Днём будзе без істотных ападкаў. Месцамі чакаецца туман. Максімальная тэмпература паветра будзе знаходзіцца ў межах ад плюс 2 градусаў па паўночным усходзе Віцебскай і да 20 цяпла па паўднёвым захадзе Брэсцкай абласцей.

А ў сераду да нас зацягне атмасферны фронт, які прынясе кароткачасовыя дажджы на большай частцы тэрыторыі краіны. Уначы будзе ад плюс 6 градусаў да плюс 12, удзень — 11—18 цяпла. Па паўночным усходзе краіны тэмпературны фон будзе ніжэйшы: уначы 3—5 цяпла, удзень — ад плюс 7 да плюс 10 градусаў. У чацвер наша краіна апынецца ў вобласці павышанага ціску, таму будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай месцамі чакаецца туман. Тэмпература ўначы складзе 4—9 цяпла, удзень будзе ў асноўным плюс 12—18 градусаў, толькі па паўночным усходзе краіны ўсяго плюс 10—11 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу ўначы пераважна без ападкаў, удзень атмасферны фронт абумовіць у асноўным па паўночна-заходняй палове краіны кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман. Тэмпература паветра ўначы будзе ад 2 да 9 градусаў цяпла, удзень — у асноўным ад плюс 8 да плюс 14 градусаў, у паўднёва-заходніх раёнах краіны цяплей — плюс 15—16 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Фестывалім

НАЙЛЕПШЫЯ МУЛЬТФІЛЬМЫ ГОДА

У Магілёве падвялі вынікі XXI Міжнароднага фестывалю анімацыйных фільмаў «Анімаёўка 2018»

Тры незабыўныя фестывальныя дні праляцелі, як адно імгненне, падарыўшы дзецям і дарослым цікавыя сустрэчы з любімымі мультфільмамі і іх стваральнікамі. Вельмі насычанай і разнастайнай была конкурсная праграма. Нагадаем, што за званні найлепшых змагаліся ў Магілёве ўжо прызнаныя майстры анімацыйнага мастацтва і будучыя мультыплікатары. У спаборніцтвах за вялікі хрустальны аловак удзельнічалі аўтары з 31 краіны. Яны прадставілі на суд міжнароднага журы, якое ўзначальваў мэтр савецкай мультыплікацыі, стваральнік легендарнага «Антошкі» Леанід Носараў, 61 стужку.

У топ-11 «Анімаёўкі» (менавіта столькі было намінацый) увайшлі стужкі «Падзенне» (Францыя), «Пяць хвілін да мора» (Расія), «Прорва» (Нідэрланды) «Пустэча» (Эстонія), «Міціна каханне» (Расія), «Маяк» (Францыя), «Bloeistraat 11» (Нідэрланды), «Каробка» (Францыя), «Падарожжа ў Тэль-Авіў» (Швейцарыя), «Ваўчанятка» (Беларусь). А мультфільмам года і ўладальнікам Гран-пры стала стужка «Меркурый» італьянскага рэжысёра Мішэля Бернардзі.

Свае лідары вызначыліся і сярод юных аніматараў. Паміж сабой канкуравалі больш за 50 стужак з пяці краін. Двойчы ў гэтых спаборніцтвах «засвяціліся» выхаванцы магілёўскай дзіцячай анімацыйнай студыі «Аловак». У намінацыі «Самы пазнавальны анімацыйны фільм» перамог твор Веранікі Радзівонавай «Легенда пра Мірскі замак» , а першы прыз у намінацыі «Найлепшы беларускі анімацыйны фільм» узяў Арцём Мазько з мультфільмам «Пярэварацень». Абедзве дзіцячыя работы створаны пры садзейнічанні педагога і кіраўніка студыі Настассі Клачковай.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Трагедыя над Яванскім морам

Пасажырскі самалёт інданезійскай авіякампаніі Lion air, які выконваў рэйс з Джакарты, пацярпеў катастрофу і ўпаў у Яванскае мора. Пра гэта паведаміла агенцтва Сіньхуа. Па папярэдніх звестках, на борце было 189 чалавек, у тым ліку сем членаў экіпажа.

Самалёт знік з радараў прыкладна праз дзесяць хвілін пасля ўзлёту. Boeing 737, які выконваў рэйс з Джакарты ў інданезійскі горад Панкалінанг на востраве Банка, узляцеў у 6.20 па мясцовым часе (2.20 па мінскім) і знік у 6.33.

Як паведамляецца, камандзір самалёта амаль адразу ж пасля ўзлёту з аэрапорта Джакарты запрасіў экстранную пасадку. Па словах афіцыйнага прадстаўніка Галоўнага ўпраўлення грамадзянскай авіяцыі краіны Сінду Рахаю, «экіпаж запрасіў вяртанне ў аэрапорт, пасля чаго сувязь з ім перапынілася, лайнер знік з экранаў радараў».

Разам з тым, як паведаміла агенцтва Reuters са спасылкай на заяву авіякампаніі, самалёт эксплуатаваўся са жніўня і быў прыдатны да палёту. Двое пілотаў паветранага судна наляталі ўвогуле 11 тысяч гадзін.

У кампаніі Boeing паведамілі, што ведаюць пра крушэнне лайнера і «ўважліва сочаць за сітуацыяй».

Ратавальнікі ўжо выявілі месца крушэння самалёта, яго абломкі, асабістыя рэчы пасажыраў.

З-за забруджвання паветра ў Еўропе заўчасна памерла каля паўмільёна чалавек

Узровень забруджвання паветра ў Еўропе ўсё яшчэ перавышае нормы і Еўрасаюза, і Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Пра гэта гаворыцца ў апублікаванай справаздачы Еўрапейскага агенцтва па ахове навакольнага асяроддзя.

Асноўныя крыніцы забруджвання паветра ў Еўропе — аўтамабілі, а таксама сельскагаспадарчая дзейнасць, вытворчасць энергіі, прамысловасць і дзейнасць асобных хатніх гаспадарак.

Больш за ўсё шкодзяць здароўю цвёрдыя часціцы, дыаксід азоту і канцэнтрацыя азону, пішуць эксперты.

Па іх звестках, перавышэнне ўзроўню канцэнтрацыі цвёрдых часціц стала прычынай заўчаснай смерці каля 422 тысяч чалавек у 41 краіне Еўропы ў 2015 годзе, уздзеянне дыаксіду азоту тады ж выклікала каля 79 тысяч заўчасных смерцяў, канцэнтрацыя азону — 17,7 тысячы.

DPA: Меркель гатова адмовіцца ад пасады кіраўніка ХДС



Канцлер Германіі Ангела Меркель гатова адмовіцца ад пасады старшыні Хрысціянска-дэмакратычнага саюза (ХДС) і не будзе вылучаць сваю кандыдатуру на выбарах лідара ХДС у снежні. Пры гэтым яна мае намер захаваць за сабой пасаду кіраўніка ўрада ФРГ, паведаміла ў панядзелак агенцтва DPA.

Паводле яго інфармацыі, аб сваім рашэнні Меркель паведаміла на пасяджэнні праўлення ХДС у святле страты партыяй галасоў на зямельных выбарах у Гесэне. З'езд хрысціянскіх дэмакратаў, на якім будзе пераабірацца партыйнае кіраўніцтва, адбудзецца ў пачатку снежня. Меркель неаднаразова заяўляла, што пасада кіраўніка ўрада непарыўна звязана для яе з пастом старшыні партыі. Раней яна паведамляла, што мае намер адпрацаваць увесь чатырохгадовы тэрмін і плануе зноў выставіць сваю кандыдатуру на пасаду кіраўніка ХДС у снежні.

Як паведаміла газета Bild, пра гатоўнасць вылучыцца на пасаду старшыні ХДС ужо заявіў былы кіраўнік парламенцкай фракцыі блока ХДС/ХСС Фрыдрых Мерц.

На рэгіянальных выбарах у Гесэне хрысціянскія дэмакраты набралі 27 %, што на 11,3 % менш, чым на мінулых выбарах у 2013 годзе.

Шок

У Лунінцы забілі васьмімесячную дзяўчынку

Зараз устанаўліваюцца абставіны гэтага жудаснага здарэння.

Па звестках следства, увечары 27 кастрычніка 28-гадовы жыхар Лунінца, прыйшоўшы дадому, знайшоў цела васьмімесячнай дачкі з прыкметамі гвалтоўнай смерці. У гэты час у кватэры знаходзіліся 25-гадовая маці дзіцяці і 47-гадовы знаёмы сям'і. Яны былі ў стане алкагольнага ап'янення. Заведзена крымінальная справа за забойства заведама малалетняга, учыненае з асаблівай жорсткасцю. Паведамлялася, што дзяўчынцы адрэзалі галаву... Па падазрэнні ў здзяйсненні злачынства затрыманы маці дзіцяці і яе знаёмы, праінфармаваў Следчы камітэт. Вядома, што гэтая сям'я была на ўліку, бо знаходзілася ў сацыяльна небяспечным становішчы. У ёй выхоўваецца яшчэ двое дзяцей — хлопчыкі чатырох і шасці гадоў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Спорт-тайм

РАЗВЯЗКА ЎСЁ БЛІЖЭЙ

У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем аб чарговым туры чэмпіянату краіны па футболе і іншых самых прыкметных спартыўных падзеях выхадных.

1. Беларускія тэнісісты прайгралі славакам з лікам 1:3 у матчы 2-га раўнда плэй-оф 1-й групы Еўра-Афрыканскай зоны Кубка Дэвіса.

У першы дзень спаборніцтваў на корце NTC Arena Ягор Герасімаў перамог Норберта Гамбаша — 3:6, 6:4, 6:4, а Марцін Кліжан перайграў Аляксандра Згіроўскага — 6:1, 6:4. У другі гульнявы дзень Максім Мірны і Андрэй Васілеўскі ў парнай сустрэчы прайгралі славацкаму дуэту Філіп Палашэк / Марцін Кліжан — 7:6, 4:6, 3:6. А затым Марцін Кліжан перайграў Ягора Герасімава ў двух сэтах — 6:4, 6:3.

Зборная Славакіі захавала прапіску ў 1-й групе, а беларусам у наступным сезоне прыйдзецца гуляць у 2-й групе Еўра-Афрыканскай зоны Кубка Дэвіса.

2. Арына Сабаленка займае 12-е месца ў абноўленым рэйтынгу Жаночай тэніснай асацыяцыі. Аляксандра Сасновіч знаходзіцца на 30-м радку, Вікторыя Азаранка займае 52-е месца, у Веры Лапко 65-я пазіцыя.

Арына Сабаленка на бягучым тыдні выступіць на турніры WTA Elite Trophy з прызавым фондам $2,3 млн у кітайскім Чжухаі. На групавым этапе малога выніковага турніру WTA згодна з жараб'ёўкай беларуска згуляе з французжанкай Каралін Гарсіяй (18 WTA) і Эшлі Барці (19 WTA) з Аўстраліі. У парным разрадзе выступіць і беларуска Лідзія Марозава, якая разам з Шука Ааяма з Японіі сустрэнецца на першым этапе з Міхаэлай Бузарнеску (Румынія) / Алісіяй Расольскай (Польшча), Фан Йін Ксун / Тан Цян (Кітай). Турнір у Чжухаі пройдзе з 30 кастрычніка да 4 лістапада.

3. Гандбалісты зборнай Беларусі атрымалі першую перамогу ў адборачным турніры чэмпіянату Еўропы 2020 года. Пасля пройгрышу дома баснійцам у гасцявым матчы другога тура беларусы абыгралі фінаў — 27:20.

Свой наступны паядынак кваліфікацыі беларускія гандбалісты правядуць у красавіку 2019 года ў гасцях у каманды Чэхіі, якая ў першым туры абыграла фінаў, а потым перамагла зборную Босніі і Герцагавіны.

4. Завяршыліся матчы 26-га тура чэмпіянату краіны па футболе. БАТЭ атрымаў перамогу на выездзе ў «Гомеля» з лікам 1:0. «Віцебск» быў мацнейшы за мінскае «Тарпеда» — 1:0. У дынамаўскім дэрбі мінчане і брастаўчане разышліся мірам — 1:1. Жодзінскае «Тарпеда-БелАЗ» на сваім полі абыграла салігорскі «Шахцёр» 1:0. Вынікі астатніх сустрэч 26-га тура: «Іслач» (Мінскі раён) — «Мінск» — 0:3, «Дняпро» (Магілёў) — «Слуцк» — 2:0, «Гарадзея» — «Смалявічы» — 4:1 , «Нёман» (Гродна) — «Прамень» (Мінск) — 0:0.

Становішча ў групе лідараў: БАТЭ — 63 ачкі, «Віцебск» — 53, «Шахцёр» — 51, «Дынама» (Мінск) — 50, «Тарпеда-БелАЗ» — 46, «Дынама» (Брэст) — 45. У самым канцы турнірнай табліцы «Дняпро», у якога 16 ачкоў, на 2 балы менш у каманды «Прамень».

Бамбардзірскі спіс узначаліў гулец брэсцкага «Дынама» Павел Савіцкі, які забіў 12 мячоў.

Адзначым, што фаварыты чэмпіянату 31 кастрычніка правядуць перанесеныя матчы розных тураў: «Дынама» (Брэст) — БАТЭ, «Шахцёр» — «Віцебск», «Тарпеда-БелАЗ» — «Дынама» (Мінск).

Беларуска — найлепшая маладая лёгкаатлетка Еўропы

Штогод у Лазане Еўрапейская лёгкаатлетычная асацыяцыя аб'яўляе пераможцаў прэміі «Залатая дарожка» («Golden tracks»), дзе найлепшым спартсменам па выніках адыходзячага сезона ўручаюць узнагароды ў намінацыях «Лёгкаатлет года» і «Узыходзячая зорка».

У кожнай з дзвюх намінацый у мужчын і жанчын звычайна ёсць па тры фіналісты. **Беларуская бар'ерыстка Эльвіра ГЕРМАН** стала ўладальніцай звання «Узыходзячая зорка» 2018 года. Першы віцэ-прэзідэнт Еўрапейскай лёгкаатлетычнай асацыяцыі, член Савета Еўрапейскай лёгкаатлетычнай асацыяцыі Дабрамір Карамарынаў уручыў памятную шкляную статуэтку Эльвіры.

Нагадаем, сёлета спартсменка стала чэмпіёнкай Еўропы ў бегу на 100 метраў з бар'ерамі, устанавіла нацыянальны рэкорд (U-23). Эльвіра таксама з'яўляецца самай маладой спартсменкай, якой удалося стаць чэмпіёнкай Еўропы ў бегу на 100 метраў з бар'ерамі за ўсю гісторыю кантынентальных спаборніцтваў.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.